УДК 664.1

# ВЫТВОРЧАСЦЬ ЦУКРУ Ў БЕЛАРУСІ (ДР. ПАЛ. XIX – ПАЧ. XXI СТСТ.)

**Пушкін І.А.**
**Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання**
**г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь**

Першыя цукровыя заводы ўзнікаюць у Расійскай імперыі ў 1840-х гг. У 1906 г. іх існавала каля 200. Адзін з першых у Беларусі быў пабудаваў цукровы завод у Дабосна на Магілёўшчыне (1840-я гг.). За 100 дзён працы ў год перапрацоўвалася да 2,99 тыс т буракоў і атрымоўвалася каля 819 т цукру. Цукрыстасць буракоў складала каля 12%. У той жа час быў пабудаваны цукровы завод у Беліцы. У 1860-я гг. узнік цукровы завод у м. Івань каля Слуцка. На ім перапрацоўвалася да 7,4 т буракоў у дзень. Цукрыстасць складала 13–13,5%, ураджайнасць – 2,835 т/га.

З-за павялічэння попыту на расійскі цукар у замежжы, з 1906 г. пачынаецца новы этап пашырэння сяўбы цукровых буракоў у Беларусі. У 1907 г. пачынаецца іх сяўба ў гаспадарцы “хутар Балычын” (каля Бабруйска). Выкарыстоўваліся мінеральныя ўгнаенні і насенне гатункаў: вільмаран, клеінванцлебан, імперыял. Ураджайнасць склала 5,62–7,946 т/га, пры цукрыстасці 12–13,5 %. У 1909–1911 гг. вырошчваліся цукровыя буракі ў маёнтках Вавулічы, Хмельнікі (гатунку “вільмаран”, ураджайнасць – 17,29 т/га, пры цукрыстасці 15,4%), “Чырвоны Бераг” (была атрымана надзвычай вялікая ўраджайнасць –73,71 т/га, пры цукрыстасці 14–17,1%).

Войны, рэвалюцыі, падзел тэрыторыі Беларусі перашкодзілі працягу працы па вырошчванню цукровых буракоў. У 1921 г. у “Чырвоным Беразе” быў заснаваны сельскагаспадарчы тэхнікум. Там была дасягнута ўраджайнасць цукровых буракоў 29,48–37,67 т/га, пры цукрыстасці 13,6–14,8 %. З 1925 гг. і да 1930-х гг. у гаспадарцы “Балычын” сеялі цукровыя буракі з насення гатунку “серпінар”. У канцы 1920-х гг. у Бабруйскай акрузе планавалася пабудаваць цукровы завод з аб’ёмам гадавой прадукцыі 1,146 тыс. т цукру штогод.

Пасля вайны ў 1951 г. быў здадзены ў эксплуатацыю Скідзельскі, у 1959 г. Гарадзейскі, у 1963 г. Жабінкаўскі цукровыя заводы, у 1965 г. – Слуцкі цукрова-рафінадны камбінат. На апошнім у 2009 г. дасягнута самая высокая прадукцыйнасць па перапрацоўцы цукровых буракоў за суткі (7907,0 т), самы высокі выхад белага цукру з адзінкі сыравіны (14,15 %) і самы нізкі себякошт цукру.

Вытворчасць цукровых буракоў у Беларусі ў 1960–1990-я гг. праводзілася на плошчы каля 50–52 тыс. га, пры ўраджайнасці 21,4 (1970 г.) – 31,2 (1990 г.) т/га і цукрыстасці 16–16,4 %. У 2005–2009 гг. плошча сяўбы павялічылася да 99,8 (92,7) тыс. га. У Беларусі ў 2003 г. было 557 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў па вырошчванню цукровых буракоў, у 2004 г. – 674, 2007 г. – 544, 2009 г. – 437. З іх 62,2% мелі ўраджайнасць вышэй за 40 т/га. Ураджай у 30–35 т/га пакрывае толькі выдаткі на вытворчасць. У асобных гаспадарках дасягнута ўраджайнасць да 50–60 т/га, пры цукрыстасці 16,1–17,5%. За 2000–2009 гг. загатоўка цукровых буракоў у Беларусі павялічылася ў 3 разы.

У пачатку XXI ст. у свеце дзейнічаюць каля 2500 цукровых заводаў. У Расійскай Федэрацыі – 90, у Беларусі – 4. Ураджайнасць цукровых буракоў у свеце прыкладна 45–60 т/га, пры цукрыстасці ад 16 да 22 %. Станаўленне і развіццё цукровай прамысловасці Беларусі пачынаецца з сярэдзіны XIX ст. Яна стала значнай часткай гаспадаркі пасляваеннай БССР і сучаснай Рэспублікі Беларусь.